www.nv-online.info

Народная Воля

№ 84 (4029)

27 кастрычніка 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

СТАТЫСТЫКА

Зарабілі…

Намінальны наяўны сярэднямесячны заробак работнікаў Беларусі ў студзені–верасні 2015 года склаў 6,625 млн рублёў, у тым ліку ў верасні – 6,863 млн рублёў, паведаміў Белстат. Па афіцыйным курсе гэта складае ўсяго толькі 397 долараў.

Колькі ў сярэднім зарабляюць у рэгіёнах?

Мінск – **9,287** млн рублёў,
Мінская вобласць – **6,874** млн,
Гомельская вобласць – **6,372** млн,
Гродзенская вобласць – **6,109** млн,
Брэсцкая вобласць – **5,944** млн,
Віцебская вобласць – **5.907** млн,
Магілёўская вобласць – **5,906** млн рублёў.

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Монолог для попсы

Их сиятельство разобиделись.

Их превосходительство уязвлены в самую пятку.

Их величество не уважили, не облизали дифирамбами, не ублажили славословием.

Кто посмел?!

Нобелевский лауреат!

Как посмела?!

И его светлость не удержался, выплеснул свои обиды на тусовке российской попсы – Дробышу, Валерии, Лепсу, Заре, Стасу Пьехе… Правильную аудиторию выбрал – им без разницы, для кого петь.

Наши тоже поют, точнее – подпевают. Но не все. Это и вызвало у его превосходительства выплеск эмоций. *«Как я сказал, я люблю искренность, скажу опять же о наших отдельных «творцах», творческих личностях, даже лауреатах Нобелевской премии, которые не успели еще ее получить, выехали за пределы страны и постарались ушат грязи вылить на свою страну. Это неправильно, это не оппозиционость. Это абсолютно неправильно, потому что Родину, свою землю, как и своих родителей, свою мать не выбирают. Она такая, какая она есть. Если ты плохо говоришь о Родине, стыдишься ее, значит, ты прежде всего плохой сын».*

…Этот конфликт “Лукашенко–Алексиевич” и – шире – “Лукашенко–Быков”, “Лукашенко – Союз белорусских писателей”, “Лукашенко – Академия наук” мне напомнил сюжеты из истории дипломатии. Когда волею судьбы сталкивались разные цивилизации, разные представления о миропорядке. И ведь не войны – мира хотели. Но…

Вот, например, древний Китай. Жила себе империя, считала себя центром всего, самоименовалась Поднебесной. Где-то там существовали Россия, Франция, Англия, и революции в них происходили, и войны, и первый полет на воздушном шаре… Но Китаю все это было неинтересно. Правильнее даже сказать, что ниже достоинства великой империи считалось снизойти и попытаться понять каких-то рыжеволосых варваров. Китай настолько был сконцентрирован на самом себе, что, мощнейшая цивилизация и морская держава, просто не стал развивать флот. Зачем?! Ведь варвары сами придут, не могут не приползти с дарами. В центр мира-то!..

Дипломатические миссии, которые добирались до Китая, там так и воспринимались – как посланцы с данью, приехавшие просить милости. Если кого-то и допускали до императора, то при условии, что будет выполнен ритуал “коу тоу”. А это означало – публично унизиться: трижды коснуться лбом пола, распростершись перед сыном неба (так называли императора) ниц.

Но посланцы, например английского короля, не могли и не хотели перед каким-то чужим правителем склоняться, будто перед Богом. Они и перед своим сувереном так не склонялись. Тем более что не с данью и не на поклон они в Пекин ехали. Просто хотели сосуществовать, торговать и, в общем, не наживать проблем. Не получилось. Пропасть в восприятии мира оказалась бездонной.

Вот и у Лукашенко с Алексиевич пропасть в восприятии мира. У Лукашенко с Быковым… У Лукашенко с Бородулиным… Потому что Лукашенко сконцентрирован только на себе. Все, что не распростерто ниц, ему представляется враждебным.

Однако помимо авторитета личной власти есть еще одно важное обстоятельство, которое делает эту пропасть бездонной.

“Для меня вопрос стоит более конкретно: где я хочу жить – в великой стране или в нормальной?” – рассуждает один из героев Светланы Алексиевич. И, собственно, об этом все ее творчество. В оценке молоха, прикрывающегося псевдовеликими идеями, миры Лукашенко и Алексиевич расходятся окончательно.

Он живет с ощущением чего-то грандиозного, где все хорошее бесконечно откладывается на завтра. И опять завтра, и 70 лет было завтра, и уже суверенных двадцать пять лет завтра, и вновь не сейчас…

Он, как некогда китайские императоры, сам себе высший авторитет. Сомнений и критики на свой счет не принимает. Наоборот, воспринимает это как посягательство на нечто святое, неприкосновенное.

Он возомнил, что он и есть Беларусь. А настоящая Беларусь, бегающая по магазинам, по обменникам, по работам и подработкам, копающаяся в грядках и самих себе, для него – народец.

Так про нас и сказал: “Народец!” И не застыдился. Не извинился.

А сейчас обиделся на Светлану Алексиевич, представив так, будто она “вылила ушат грязи на свою страну”!

Откуда такая трепетная национальная чувствительность у человека, который является рекордсменом в высказывании нелепостей о Беларуси, о белорусах и обо всем белорусском?

А все потому, что не белорусов и не свою Родину критикует Светлана Алексиевич. Она критикует белорусскую власть. В понимании Лукашенко – критикует святое.

В том восприятии мира, в котором пребывает белорусский руководитель, Алексиевич практически покушается на основы государственого строя. Потому что она пишет и говорит о том, что ее народ достоин жить в нормальной стране, а не в стране великих, грандиозных и бесконечных фантомов.

В нормальной стране! А не в стране, где власть – превыше всего. Не в стране, где уютно себя чувствуют, обласканы, награждены орденами и медалями только те, кто выполняет нечто сродни древнекитайскому ритуалу “коу тоу”.

В Беларуси, как известно, этот ритуал превратился в “дай боцік пацалую”. Вот только Алексиевич не поцелует. И в том числе за это – за гражданскую позицию – Светлана Александровна удостоена самых престижных мировых наград в области литературы, и вот теперь высшей награды – Нобелевской премии.

А его превосходительство, величество и сиятельство, первый президент Беларуси, – отмечен, как все помнят, только Шнобелевской. И теперь высказывает свои обиды тем, кто толпится у ботика. Но ирония в том, что только они и посочувствуют. Потому что мы не в древнем Китае живем, мы живем в Европе XXI века. И уже прекрасно осведомлены, что королей, императоров, генеральных секретарей и президентов в истории было много разных, а вот гениев у каждого народа – единицы. И тут как раз та ситуация, когда, даже будь ты пять раз президент, надо помолчать, послушать и даже пойти на поклон. Корона не упадет. Потому что нету короны.

ФОТАФАКТ

Дрэва міру



Напрыканцы мінулага тыдня ў сталічным Лошыцкім парку адбылося сімвалічнае мерапрыемства – пасадка Дрэва міру і ўстойлівага развіцця ў гонар 70-годдзя заканчэння Другой сусветнай вайны і заснавання Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. У маі гэтага года такое ж дрэва было пасаджана па ініцыятыве нашай краіны ў штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку.

У Мінску ў цырымоніі браў удзел **Аляксандр Лукашэнка**, адміністратар Праграмы развіцця ААН, рэгіянальны дырэктар па краінах Еўропы, СНД і Балтыі **Джыхан Султанаглу**, пастаянны каардынатар ААН і пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі **Санака Самарасінха**, прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу.

Лошыцкі парк быў абраны невыпадкова. Менавіта ў гэтай старажытнай сядзібе *ў 1946–1947 гадах размяшчалася місія адміністрацыі дапамогі і аднаўлення Аб’яднаных Нацый (UNRRA), якая* была створана дзяржавамі для аказання дапамогі краінам, найбольш пацярпелым у Другой сусветнай вайне, у тым ліку Беларусі. Місія аказвала эканамічную дапамогу, займалася рэпатрыяцыяй і падтрымкай бежанцаў у пасляваенны час. *У савецкія часы згадкі пра* гуманітарную місію UNRRA былі забаронены.

На мінулым тыдні на Лошыцкай сядзібе з’явілася мемарыяльная дошка, якую адкрылі не толькі ў памяць аб працы місіі, але і як напамін аб салідарнасці і ўзаемадапамозе: UNRRA ў складаныя пасляваенныя гады выдаткавала на дапамогу Беларусі 61 мільён долараў.

«Пастаўкі UNRRA ў першыя пасляваенныя гады прадуктаў, насення, тэхнікі дапамаглі Беларусі перажыць разруху і голад, – адзначыў Часовы Паверанны ў Справах ЗША ў Беларусі **Скот Роланд**. – *Як амерыканец, я ганаруся тым, што ў складзе місіі працавалі мае суайчыннікі. ... Заслугоўвае памяці і жыццё асобнага чалавека – супрацоўніцы місіі Рут Уолер, якая памерла 4 жніўня 1946 года. Рут захварэла пасля таго, як дапамагла выратавацца беларускім хлапчукам, якія патаналі. Яна пахавана на Вайсковых могілках у Мінску».*

Ігар ЗАЛЕСКІ.

Адрэстаўраваны будынак Лошыцкай сядзібы, апошнім гаспадаром якой быў Еўстафій Любанскі.



ПРЯМАЯ ЛИНИЯ

Не чихать на простуду

Осень – пора простуд и плохого самочувствия. Медики утверждают, что в это время вирусными инфекциями мы болеем в два раза чаще обычного.



Откуда появляется простуда?
Как отличить простуду от гриппа?
Как обезопасить себя от вирусов осенью?
Стоит ли прививаться от гриппа?
Что делать, если все-таки заболел?

На эти и другие вопросы на «Прямой линии» ответит заведующая терапевтическим отделением медицинского центра «ЛОДЭ», врач 1-й категории **Людмила Андреевна ГУЛЕВИЧ.**
Звоните **сегодня, 27 октября, с 15.30 до 16.30 по телефону 328-68-41.**

Пока не поздно, присылайте свои вопросы электронной почте **nvonlineinfo@gmail.com** с пометкой «Прямая линия».

БЕЛАРУСЬ–ЕС

…пісьмовай працэдурай

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Савета ЕС, на пасяджэнні Савета міністраў замежных спраў у Люксембургу 26 кастрычніка беларускае пытанне не абмяркоўвалася. У прэс-службе Савета ЕС кажуць, што, згодна з рэгламентам, рашэнне пра далейшы лёс санкцый можа быць прынята на любым пасяджэнні Савета ЕС.

«Не абавязкова, каб гэта быў Савет міністраў замежных спраў. Але калі не запланавана наогул ніякіх пасяджэнняў, – а на гэтым тыдні больш не будзе сустрэч Савета да 31 кастрычніка, – рашэнне заўсёды можа быць прынята пісьмовай працэдурай», – паведаміла прадстаўніца прэс-службы.

ТЫМ ЧАСАМ

Санкцыі застануцца…

Паводле звестак агенцтва Reuters, пад санкцыямі застануцца чатыры чалавекі, якіх ЕС лічыць датычнымі да знікненняў у Беларусі ў 1999–2000 гадах **Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзмітрыя Завадскага.**

Гэта **Уладзімір Навумаў** (былы міністр унутраных спраў), **Віктар Шэйман** (былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта), **Юрый Сівакоў** (у перыяд знікнення палітыкаў займаў пасаду кіраўніка МУС) і **Дзмітрый Паўлічэнка** (камандзір брыгады спецназу ўнутраных войскаў МУС). Акрамя таго, хутчэй за ўсё замарозка санкцый не закране экспарцёра ўзбраенняў «Белтэхэкспарт».

ПАЛІТКУХНЯ

Балбатня як аснова палітыкі

Былая кандыдатка ў прэзідэнты Тацццяна Караткевіч і кіраўнік яе выбарчага штаба Андрэй Дзмітрыеў у Вілсанаўскім цэнтры ў Вашынгтоне правялі сустрэчу з амерыканскімі экспертамі і расказалі пра вынікі мінулай палітычнай кампаніі і пра свае планы.

– Самае галоўнае сёння для нас – захаваць падтрымку ў грамадстве нашых ідэй, – распавяла Тацццяна Караткевіч. – Зрабіць так, каб да 2020 года (*наступныя прэзідэнцкія выбары.* – **Рэд.**) яна захавалася і мы ўжо не стартавалі з нуля, як у папярэднія кампаніі, а мелі падтрымку як лідараў, так і праграм.

Першае, што мы будзем працягваць, – дыялог аб тым, якія менавіта перамены нам патрэбны, бо сёння ўжо ўлада на ўсю моц трубіць пра тое, што трэба паважаць, людзей, патрэбны перамены, патрэбны рэформы ў эканоміцы. І самае важнае нам тут – узяць у гэтым актыўны ўдзел, даваць зваротную сувязь.

Менавіта таму наша ідэя на бліжэйшы год – праводзіць агульнанацыянальны форум «За мірныя перамены», дзе мы будзем абмяркоўваць усе тыя рэальныя крокі, якія патрэбны сёння ў эканоміцы, культуры, адукацыі, медыцыне, сацыяльнай палітыцы, і даводзіць гэта да мясцовых і рэспубліканскіх улад.

І другі крок, які для нас вельмі важны ў найбліжэйшай перспектыве, – парламенцкая кампанія. Мы бачым, што гэты форум можа дапамагчы стварыць аснову для праграмы нашых прэтэндэнтаў, а таксама будзе развіваць наш парадак дня перамен. Мы таксама сёння разумеем, што трэба здзейсніць крокі, якія зрабілі б падлік галасоў у парламенцкай кампаніі празрыстым.

Тацццяна Караткевіч зазначыла, што, магчыма, тым, хто назірае за Беларуссю звонку, здаецца, што ў нашай краіне нічога не адбываецца. Але, на яе думку, гэта не так.

– Мы якраз прыехалі сюды расказаць, што нешта адбываецца, – прызналася Караткевіч. – Першае, што я хацела б адзначыць, – з’явіўся новы дастаткова вялікі пласт людзей, якія сёння зацікаўлены ў тым, каб удзельнічаць у палітыцы, зацікаўлены ў тым, каб адбыліся перамены, і менавіта гэтыя людзі натхняюць нас на нашу дзейнасць. За гэту кампанію нам удалося сфарміраваць у людзей патрэбу цікавіцца палітыкай, удзельнічаць у прыняцці рашэнняў.

Як сведчыць “Голас Амерыкі”, адказваючы на пытанне, чаму замест паездкі па Беларусі для сустрэчы са сваімі выбаршчыкамі яна перш за ўсё адправілася ў Брусель і Вашынгтон, Караткевіч сказала, што хацела скарыстацца магчымасцю і падтрымаць цікавасць да Беларусі за мяжой.

Ні кандыдат, ні кіраўнік яе штаба не сталі раскрываць канкрэтныя крыніцы фінансавання перадвыбарнай кампаніі, спаслаўшыся на тое, што такая інфармацыя можа прывесці да праблем з бяспекай. Дзмітрыеў прывёў у прыклад справу Алеся Бяляцкага, асуджанага ў 2011 годзе за сваю праваабарончую дзейнасць. Ён, аднак, настойвае на тым, што “Гавары праўду!” ніколі не падтрымлівалася расійскімі грашыма або грашыма беларускага рэжыму.

Адказваючы на пытанне аб малодшым сыне Лукашэнкі – Мікалаі – і магчымасці перадачы ўлады ў спадчыну, Караткевіч заклікала ўвогуле не ўзнімаць гэта пытанне, у тым ліку на міжнародным узроўні, паколькі гэта справа доўгатэрміновая. Замест гэтага, на яе думку, варта засяродзіцца на бягучых праблемах.

На думку Тацццяны Караткевіч, яна стала наватарам у беларускай палітыцы. «Нам удалося сфарміраваць новы від палітыка, які адкрыты для людзей, актыўна іх слухае, разумее, пра што яны кажуць”, – пахваліла Караткевіч сама сябе.

Цікава, што на сустрэчы прысутнічаў Паверанны ў Справах Рэспублікі Беларусь у ЗША Павел Шыдлоўскі, і ён таксама хваліў Тацццяну. «Я вельмі рады, што Тацццяна Караткевіч сёння тут з намі, – сказаў ён. – На маю думку, яна правяла сваю кампанію з тактам і годнасцю. Яна дадала прыстойнасці і годнасці прэзідэнцкай кампаніі ў Беларусі».

І чаму ж не пахваліць, калі Тацццяна мірна, спакойна, ціха і нават радасна дазволіла ўладзе выкінуць галасы выбаршчыкаў, якія паверылі ў магчымасць мірных перамен і прагаласавалі за яе? Па крайняй меры на Захадзе яна сцвярджала, што набрала да 35% галасоў, але “не трэба засяроджвацца на мінулым”. Бо на парадку дня – новая выбарчая кампанія… Карацей, з такой кандыдаткай перамен мы будзем чакаць бясконца.

Ігар МАРОЗАЎ.

КРОПКІ НАД “І”

Пустышка

Калі хто думаў, што Тацццяна Караткевіч ішла на выбары, каб змагацца за прэзідэнцкую пасаду, ён, я лічу, памыляўся. Мы ўбачылі толькі адно – сеанс барацьбы за лідарства ў апазіцыі. Тацццяна ўвогуле не крытыкавала Аляксандра Лукашэнку: маўляў, “гэтага не хочуць людзі”. Але цяпер, спасылаючыся на ўсё тых жа людзей, заяўляе, што новы лідар апазіцыі, новы палітык – гэта яна і ёсць. А разам з ёй – кампанія “Гавары праўду!”.

Па цынізме, беспрынцыпнасці і нахабстве кампаніі, роўнай таму, што паказала Караткевіч, мы яшчэ не бачылі. Яшчэ ніколі, атрымаўшы менш за 5% галасоў, апазіцыйныя палітыкі не святкавалі “перамогу”. Яшчэ ніколі, пабачыўшы, як знікаюць галасы іхніх выбаршчыкаў, яны не радаваліся і не сцвярджалі, што “задаволены вынікам”. Яшчэ ніколі, выступіўшы ў ролі штрэйкбрэхераў, ніхто з апазіцыі не трымаўся так цвёрда, упэўнена і нават з выклікам. Яшчэ ніколі падчас выбарчай кампаніі паняцці “мараль” і “маральнасць” не здымаліся з парадку дня. І вось гэта здарылася.

Сапраўды, навошта біцца ў сцяну, сядзець у турмах, дабівацца і змагацца, калі апазіцыйную дзейнасць можна звесці да абмеркаванняў, форумаў, паездак, сустрэч, балбатні і бясконцага фармулявання прапаноў?

Сапраўды, навошта канфліктаваць з дзеючай уладай, калі можна абыходзіць вострыя вуглы, крытыкаваць мякка, па шорстцы – не крытыкаваць нават, а шкадаваць?

Навошта дабівацца таго, каб у краіне былі сапраўдныя выбары, калі значна прасцей называць лічбы сваёй падтрымкі, гледзячы ў столь, у неба, у мары?

І так прыемна потым паехаць не ў Пухавічы якія-небудзь, а ў Брусель, Нью-Ёрк, Вашынгтон… І расказваць там, як мужна і адважна ты змагаешся за краіну, за людзей, за светлую будучыню. І ўсё, што ні адбываецца, – твая заслуга. Лукашэнка пра рэформы загаварыў? Падымай руку і крычы: “Мая заслуга!” Пра немэтазгоднасць размяшчэння расійскай авіябазы? “Мая заслуга!” Пра тое, што ўлада павінна ўважліва ставіцца да людзей? Сцвярджай: “Я, я і толькі я яго да гэтага прымусіла!” Гэта ўнутры Беларусі падман будзе хуценька раскрыты і высмеяны, але калі даводзіць лухту недасведчаным людзям на Захадзе, то, можа, хто і паверыць…

І ўсё ж, калі сур’ёзна, то ўжо відавочна, што кампанія “Гавары праўду!” на гэтых выбарах падкінула грамадскасці ідэю-пустышку: маўляў, у дзеючую ўладу трэба ўбудавацца, пры Лукашэнку можа быць створана канструктыўная апазіцыя. Трэба толькі яго залагодзіць, не раззлаваць, і вось тады адбудуцца мірныя перамены.

Смешна, праўда? Разлічана на наіўных і легкаверных. Бо, каб прыняць гэты тэзіс і паверыць у гэтую ідэю, трэба ўвогуле не разумець сутнасці аўтарытарных рэжымаў. Пры іх ніякія адхіленні ад “лініі партыі” не дазваляюцца: альбо ты верна служыш, альбо ты вораг. Гэта закон! Такі самы, як законы Ньютана ў фізіцы і тэарэмы Піфагора ў геаметрыі.

Кампанія “Гавары праўду!” і Тацццяна Караткевіч на выбарах “верна адслужылі”, заклікаўшы ўсіх не пратэставаць, не байкатаваць, а галасаваць і не зважаць на афіцыйныя вынікі падліку галасоў. Дапамаглі ўладзе, як кажуць, “выпусціць пар”. Вось толькі наўрад ці будзе падзяка. Бо навошта Лукашэнку палітык Караткевіч, нават калі яна верна служыць? Ён адзін у краіне павінен заставацца сапраўдным палітыкам. На гэтым рэжым і трымаецца.

Што ж тычыцца апазіцыйнага асяродку, то рэпутацыя “Гавары праўду!” сапсавана непапраўна. І наўрад ці важкі на Захад здольны гэтую сітуацыю выправіць.

Алена НОВІКАВА.

НАДВОР’Е

Холадна, але без дажджоў

Сёння днём +5...+11°С. У сераду халаднаватае паветра паўночных шырот прынясе ў асобныя раёны краіны невялікія ападкі, у асноўным дождж. Ноччу і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра мінімальная ноччу -3...+4°С, максімальная днём +2...+9°С.

У чацвер і ў пятніцу ўладу над надвор’ем возьме халодны скандынаўскі антыцыклон, які прынясе халаднаватае, пераважна без ападкаў надвор’е. Ноччу будзе -5...+2°С, днём максімальная тэмпература +2...+8°С.

У выхадныя дні з паўднёва-ўсходнімі вятрамі ў краіну пачне паступаць больш цёплае паветра, тэмпература днём злёгку падвысіцца, а вось уначы чакаюцца замаразкі.

ЖАХ!

Беларускіх гастарбайтараў расстралялі ў Расіі

Адзін загінуў, трое паранены. Пра жудасную гісторыю распавёў "Московский комсомолец". Гісторыя падаецца так. Канфлікт адбыўся ў горадзе Перасвет Сергіева-Пасадскага раёна ў ноч на 5 кастрычніка. Там мясцовы жыхар, які працуе ў мясцовым АМАП (капітан паліцыі Павел Сталяроў), сутыкнуўся з кампаніяй з 6–8 гастарбайтараў з Рагачоўскага раёна. Яны былі даволі п'яныя, і бойка завязалася на роўным месцы. Крыху пазней сілавік, трохі працверазеўшы ў сябе, патэлефанаваў 33-гадоваму былому стралку АМАП Рафіку Агамагамедаву, які пражываў за некалькі дамоў ад месца здарэння. Той прыбыў на дапамогу, узяўшы з сабой траўматычны пісталет. Разам з таварышам яны вырашылі ўціхамірыць агрэсараў, зноў завязалася бойка, Рафік адкрыў агонь па нагах. Трох хуліганаў ён паспеў параніць.

Калі яго збілі з ног, падаючы, ён стрэліў у галаву аднаму з нападнікаў. Куля прашыла чэрап, і той памёр імгненна.

Цікава, што ў 2012 годзе Агамагамедаў разам з парай баявых таварышаў дапамаглі пенсіянеру, да якога прысталі п'яныя хуліганы на тэрыторыі Перасвета. Калегі доўга ўспаміналі, што Рафік ні на секунду не засумняваўся ў рашэнні абараніць пажылога мужчыну, нават калі на яго наставілі «ствол». У Агамагамедава стрэлілі двойчы, адна з куль прайшла праз шчаку і пакінула шрам на твары.

Стралка і яго таварыша затрымалі і ўжо асудзілі – Агамагамедаў сеў на паўтара года агульнага рэжыму. Як патлумачыў памочнік кіраўніка ГСУ СК РФ па Маскоўскай вобласці Вольга Врадзій, па дадзеным факце следчым аддзелам па горадзе Сергіеў-Пасад распачата крымінальная справа па артыкуле КК РФ «Забойства».

НЕРУХОМАСЦЬ

Кватэры ў мінскіх навабудоўлях таннеюць

Праўда, як адзначаюць спецыялісты, кошты знізіліся на 2%. Размова ідзе не пра элітнае жыллё, а кватэры ў навабудоўлях класаў «эконом» і «стандарт», якія найбольш запатрабаваны ў пакупнікоў. У верасні 1 кв.метр жылля каштаваў у такіх дамах 1160 долараў і 1290 долараў адпаведна.

Што тычыцца новых кватэр класа «камфорт», сярэдняя цана "квадрата" тут склала ў верасні 1460 долараў.

ВАКАНСІІ

Сталіцы не хапае рабочых, прыбіральшчыц і ўрачоў

Самы высокі ўзровень заработнай платы па адкрытых у Мінску вакансіях складае амаль 70 мільёнаў рублёў, паведамляе Камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Але, каб паўдзельнічаць у конкурсе на атрыманне пасады, дзе плацяць такія грошы, трэба валодаць англійскай і ўкраінскай мовамі. Сама пасада гучыць так: дырэктар з вопытам працы ў арганізацыях міжнародных плацежных сістэм з абарачэннем электронных грошай.

Дарэчы, усяго 1 кастрычніка было адкрыта 6900 вакансій, значная большасць з якіх па працоўных спецыяльнасцях – 4200. Пры гэтым больш за 70% вакансій – з заработнай платай у 3–10 мільёнаў рублёў.

У сталіцы па-ранейшаму ў дэфіцыце працоўныя будаўнічых спецыяльнасцяў, слесары, кухары, прадаўцы, санітары, прыбіральшчыцы, інжынеры, урачы і медсёстры.

У той жа час на рынку працы запыт кіроўцаў аўтамабіля, сталяроў, дворнікаў і вартаўнікоў, а таксама бухгалтараў і эканамістаў.

ПОСЛЕ СОБЫТИЯ

Белорусская энергетика может позеленеть

Почти две недели в Минске провели представители топ-менеджмента ведущих мировых компаний. Они принимали участие в работе 79-й Генеральной ассамблеи Международной электротехнической комиссии. Об итогах работы масштабного технического и бизнес-форума, форс-мажорах и кулуарах ассамблеи «Народной Воле» рассказал директор ОАО «Беллис», секретарь национального комитета МЭК Юрий Пашик.

Приехали без жен и жалели об этом

Почти все делегаты отметили высочайший уровень организации Ассамблеи МЭК.

– Генассамблея прошла успешно, – *говорит Юрий Александрович.* – Было много волнений, но, мне кажется, нам удалось поставить хорошую финишную точку, организовать стильную церемонию закрытия ассамблеи. На открытии форума сильное впечатление на делегатов произвело обращение нашего легендарного ученого Бориса Кита, который в свое время работал в одном из технических комитетов МЭК. А на закрытии вся ассамблея пожелала нашему легендарному Борису Киту сил и здоровья.

В рамках Генассамблеи свой талант смогли представить еще два талантливых человека. Это автор 3D-голограммы **Кирилл Чикеюк** и певец **Глеб Матвейчук** (*артист родился в Москве, но его отец долгое время работал художником-постановщиком на «Беларусьфильме», в Минске Глеб получил музыкальное образование, закончив музыкальный колледж по специальности «дирижер-хоровик»*). Сочетание мудрости, опыта и мастерства с молодостью и задором показалось делегатам очень приятным.

Перед началом каждого заседания мы раскладывали смайлики (веселый, грустный и равнодушный), при помощи которых делегаты выставляли оценку прошедшему мероприятию. Я был приятно удивлен: грустные смайлики не использовали вообще. Правда, количество мандаринов и лимонов, которые были символами смайликами, участвовавшими в голосовании, разделилось примерно 50 на 50. Дело в том, что я у себя в офисе прямо на входе поставил две большие тарелки с фруктами. На одной написал «Косяк Yes», на второй – «Косяк No». Каждый, кто был вовлечен в этот процесс, утром или вечером приходил в офис, записывал свою фамилию и причину, по которой берет лимон или мандарин. Лимонов, конечно, съели много. Но с другой – приятно, что многие моменты были незаметны для наших гостей и они остались удовлетворены уровнем проведения.

А еще почти все наши гости были впечатлены своим общим ощущением от страны. На ассамблею приехали представители 86 стран. Некоторые про Беларусь вообще ничего не слышали. А другие… Топ-менеджеры обычно ездят на Генассамблею МЭК с супругами – такова традиция. На этот раз многие не взяли своих жен, потому что думали, что Беларусь – это страна, где по одной стороне улицы ходят хмурые полицейские с собаками, а по другой – перепуганное население. Но когда они увидели Минск, архитектуру, к которой мы порой относимся достаточно критично, людей – в общем, им все очень понравилось.

Американцев поразило, что мы привлекли в работе Ассамблеи МЭК студентов-волонтеров из БГУИР и иняза. Они помогали делегатам буквально везде: при регистрации в отеле и на заседаниях оказывали поддержку, консультировали. Американцы сказали, что возьмут наш опыт на вооружение…

Зеленая энергетика: проект ближайшего будущего

Как уже сообщала «Народная Воля», специалисты ОАО «Испытания и сертификация бытовой и промышленной продукции «БЕЛЛИС», совместно с Немецким обществом по международному сотрудничеству GIZ реализуют ***проект технической помощи Евросоюза «Поддержка в области норм и стандартов в сфере энергоэффективности потребительских товаров и промышленной продукции ENPI/2013/280-415».*** *На Ассамблее МЭК немало внимания уделили результатам этого проекта. Так, большой интерес и живую дискуссию вызвал доклад директора ОАО «Беллис».*

– На всех, кто принимал участие в этом форуме, произвели впечатление и результаты проекта, и то, что мы создаем такое количество испытательных лабораторий, а также новых стандартов, введение которых позволит существенно снизить потребление энергии в стране к 2020 году, – *рассказывает Пашик.* – Было много вопросов, в том числе и от тех стран, где все это еще только планируется сделать. Их интересовало, каким образом мы взаимодействовали с общественными организациями, обществами защиты прав потребителей, требовалось ли вносить какие-то изменения в законодательство. Не скрою: мне приятно, что проект получил такую высокую оценку и мы выступили примером эффективной реализации экономической помощи Евросоюза.

Надеюсь, что в том числе и благодаря обсуждению этой тематики на Ассамблее мы ускорим принятие и введение в действие регламента Евразийского экономического союза по энергоэффективности. Но на этом мы не намерены останавливаться. У нас уже есть конкретные предложения по дальнейшему продвижению темы энергоэффективности в рамках Глобального экологического фонда. Нам удалось выйти практически на подготовительную фазу проекта ПРООН в области светодиодного освещения.

Кстати, выступая на ассамблее, представитель Германии сказал, что в ближайшие годы Германия намерена полностью перейти на зеленую энергетику. Я считаю, нам тоже нужно стремиться к этому.

Глобальная проверка

В конце этого года в Беларуси заработают новые испытательные лаборатории, на создание которых потрачено около четырех миллионов долларов. В Минске они будут располагаться в Белорусском государственном институте стандартизации и сертификации (БелГИСС).

– Там будет такая своего рода маленькая испытательная фабрика, – *рассказывает директор «Беллис».* – Также мы закупили восемь комплектов новейшего оборудования для всех областных подразделений Департамента по энергоэффективности. Мобильное измерительное оборудование позволит оценивать параметры энергоэффективности зданий и сооружений. То есть подъехал к зданию, посмотрел, как выполнены ограждающие конструкции, как работает отопительное оборудование, оценил качество электросети в розетке (чем чище электропитание, тем меньше потерь происходит).

Как только заработают минские лаборатории, которые будут оценивать энергоэффективность оборудования, мы вместе со специалистами Госнадзора начнем серию мероприятий по контролю за рынком. В магазинах будем отбирать определенные группы продукции и испытывать их, оценивать энергоэффективность. Под контроль попадет техника различных производителей, в том числе белорусских и известных зарубежных брендов. Наша цель – оценка текущего состояния рынка, мы должны знать, какая продукция сегодня находится в продаже, соответствует ли она требованиям, которые мы заложили в стандарты.

Каких результатов мы ждем? Если говорить о различных производителях, поставляющих в Беларусь свою продукцию, то у некоторых могут быть выявлены серьезные несоответствия с теми требованиями, которые мы собираемся ввести у себя на рынке в самое ближайшее время. Мы оценим также импортную продукцию, которая производится и на Западе, и на Востоке, где уже есть требования по энергоэффективности. Посмотрим, насколько маркировка продукции соответствует реальному состоянию изделия. У меня есть опыт, когда некоторые производители могут нарисовать на этикетке любой класс энергоэффективности, который не может быть подтвержден. Мы будем бороться с этим.

ТОЛЬКО ЦИФРЫ

В рамках 79-й Генеральной ассамблеи МЭК в Минске состоялось 229 заседаний различных комитетов.

На ассамблею приехали 1086 человек из 86 стран.

Из Беларуси было зарегистрировано 253 делегата, из них приняли участие в заседаниях 193 человека из 45 организаций и предприятий. Белорусские эксперты приняли участие в 27 технических заседаниях.

На Ассамблее МЭК в Минске работал 61 волонтер из Белорусского государственного университета информатики и радиоэлектроники и Минского государственного лингвистического университета.

КУЛУАРЫ

Не обошлась Генассамблея МЭК в Минске и без некоторого форс-мажора. «На любое недоразумение мы стремились отреагировать очень оперативно», – говорят организаторы так называемой технической олимпиады.

Лучшие нейрохирурги и спецсамолет для австралийца

Перед открытием Ассамблеи несчастный случай произошел с австралийцем Роном Колисом. Сразу после длительного перелета он решил поприветствовать своих коллег и приехал в отель «Виктория-Олимп». Через некоторое время Колис отправился в свой отель, расположенный неподалеку. Но, когда он выходил из «Виктории-Олимп», в стеклянных крутящихся дверях ему стало плохо. Он неудачно упал и сломал одну из последних костей перед основанием черепа. Случился моментальный отек мозга. В Больнице скорой помощи австралийцу сделали операцию.

«Должен сделать комплимент белорусским врачам, – говорит Юрий Пашик. – *Когда уже началась подготовка к транспортировке Рона Колиса в одну из лондонских клиник, они обнаружили две гематомы, образовавшиеся в результате удара. Их нужно было удалять, чтобы снять давление на определенные участки головного мозга. И если это не сделать или сделать позже, то есть риск, что эти участки головного мозга не восстановятся. Наши доктора взяли на себя эту инициативу. Это всех очень тронуло. Супруга Рона, приезд которой мы срочно организовали в Минск, дала согласие на операцию».*

Через пару дней спецсамолетом Рона транспортировали в лондонскую клинику. Сейчас состояние австралийца стабильное, но лондонские медики пока решили его не выводить из медикаментозной комы и еще понаблюдать. Во всяком случае такая информация была в конце минувшей недели. Белорусские медики делали благоприятные прогнозы по поводу дальнейшего самочувствия австралийца.

«Хочу искренне поблагодарить главного врача Больницы скорой помощи Андрея Владимировича Борисова и в его лице весь персонал, а также профессоров-нейрохирургов, которые делали операцию нашему коллеге», – говорит Юрий Пашик.

Международный скандал из-за вируса Эбола

В неприятную ситуацию попал и еще один делегат Генассамблеи МЭК. К счастью, его жизни ничто не угрожало, тем не менее понервничать ему пришлось изрядно. Дело в том, что Гана, в которой он живет, включена в перечень стран, жители которых по приезде в Беларусь должны при себе иметь документ, подтверждающий, что у них не было контактов с носителями вируса Эбола.

«Мы предупреждали, что такие документы обязательно нужны, – рассказывает директор «Беллис». – *Он прошел все необходимые тесты у себя в аэропорту и получил сертификат, где были указаны отрицательные результаты по всем инфекционным заболеваниям. Но оказалось, что африканские медики забыли поставить ему галочку напротив вируса Эбола. Естественно, наши службы заявили, что не могут ему выдать визу. А наш гость является представителем какого-то уважаемого африканского племени, и все граждане африканских стран, которые в то время находились в зоне визового контроля и наблюдали за развитием ситуации, стали высказывать с ним солидарность. Напряжение нарастало, и пограничники были вынуждены на некоторое время изолировать нашего гостя».*

К счастью, конфликт быстро урегулировали.

Таксисты возвращали деньги

Некоторые делегаты Генассамблеи МЭК жаловались организаторам, что такси в Беларуси стоит сумасшедших денег. Оказалось, что отдельные таксисты применяли к иностранцам какие-то собственные тарифы.

«С нашей стороны были предприняты определенные усилия, нам удавалось находить этих таксистов, и после определенной профилактической работы они приезжали и возвращали деньги. – говорит Пашик. – *Это производило невероятное впечатление на наших гостей!»*

Штраф за двух канадцев

В последние дни работы Генассамблеи двое канадцев неожиданно обнаружили, что у них закончилась белорусская виза.

«Визы им оперативно продлили, – говорит Юрий Пашик. – *Правда, учитывая, что я лично всем подписывал приглашения, а это значит, что отвечаю за соблюдение ими законодательства Беларуси, мне выписали штраф – 1.800.000 белорусских рублей».*

Большое спасибо!

– Я очень хочу поблагодарить руководство комплекса отелей «Виктория» и весь персонал – они работали на высочайшем уровне, – отмечает Пашик. – *Конечно, были некоторые нюансы, но каждый раз за счет быстрого реагирования мы вместо грустного получали веселый смайлик.*

Дайте две!

Почти все делегаты были невероятно тронуты сувенирами, которые им вручили в Беларуси. Среди подарков, напомним, была белорусская вышиванка, которую многие с удовольствием носили во время ассамблеи.

«Некоторые даже подходили и просили дать с собой еще несколько экземпляров – для родственников, друзей и близких», – с улыбкой рассказывает директор ОАО «Беллис».

Марина КОКТЫШ.

НАКИПЕЛО

«Женская тема» закрыта

Пока на Западе слушают правду, полуправду и откровенные небылицы из уст активных участников президентских выборов в Беларуси, люди, хорошо знающие ситуацию, высказываются о кампании Короткевич не просто резко, а крайне резко.

«Я чрезвычайно редко это делаю, – оговорилась правозащитница ***Елена Тонкачева****, лишенная вида на жительство в Беларуси за свою активную деятельность, – но это – манифест». Правозащитница написала резкий пост на своей странице в «Фейсбуке».*

Женское (бабье – по словарю Лидии Ермошиной) лицо белорусской политики после президентских выборов 2015 года – это:

– человек, который представляет некую кампанию, НЕ ИМЕЮЩУЮ ИДЕОЛОГИИ и, соответственно, обязательств;

– человек, который за деньги [illegible] секретарей;

– человек, который был секретарем и стал «новым политиком» СРАЗУ (за два месяца);

– человек, который откровенно врет, что его выдвинул Владимир Некляев или хоть какой конгломерат политических партий или организаций;

– человек, который в публичном интервью говорит о законности еще двух сроков Александра Лукашенко (это после четырех-то!);

– человек, который не знаком с конституционным устройством Республики Беларусь ВООБЩЕ, так как и в публичном интервью искренне удивляется, что в случае избрания президентом ему следует исполнять обязанности главнокомандующего; и, прости, Господи, собирается эту функцию «передать» как-нибудь;

– человек, который публично лукавит (*в оригинале, скажем так, более емкое слово.* – **Ред.**) про финансирование его избирательной кампании и отказывается от собственных публичных заявлений о готовности войти в правительство;

– человек, который врет людям и всему миру про то, что он единый кандидат от демократических сил;

– человек, которого хвалит Лидия Ермошина, президент и несвязную речь которого ОЧЕНЬ хвалит по бумажке дипломатический корпус.

«Женское лицо белорусской политики» случилось половой тряпкой, и потребуется много времени (очень много времени), прежде чем ЖЕНЩИНА-ПОЛИТИК появится в общественном сознании и политике… Татьяна Короткевич сделала все возможное для полного «слива» женской темы в белорусской политике в перспективе 15–20 лет.

ЗДАРЭННЕ

«Гляджу, а дзяўчынка апускаецца ў дрыгву…»

Ратавальнікі выцягнулі з балота ў цэнтры Мазыра 10-гадовую школьніцу.

У мінулую суботу каля 17.20 мазырскім ратавальнікам паступіла паведамленне аб тым, што дапамога патрабуецца дзяўчынцы, якая завязла ў гразі і самастойна выбрацца не можа. Першай школьніцу заўважыла ў балоце мясцовая жыхарка **Анжэла КАЗЛОЎСКАЯ**, якая і патэлефанавала ў МНС.

– У той дзень я выпадкова выйшла на балкон, каб праветрыць кватэру, – распавяла яна "Народнай Волі". – А перасохлы вадаём – акурат ля нашага дома. На возеры знаходзіліся тры дзяўчынкі – па 8–12 гадоў. Ходзяць, нешта разглядаюць… У мяне самой 11-гадовы сын, дык я і яму яшчэ лекцыю прачытала, у якіх месцах можна гуляць, а дзе катэгарычна нельга. І тут заўважаю, што дзве дзяўчынкі пайшлі направа, а адна – па прамой. І раптам школьніца абедзвюма нагамі трапляе ў нейкую яму, бачу, што яна апускаецца ў дрыгву… Адным словам, недзе па пояс яе зацягнула ў тое балота. Сяброўка хацела дапамагчы, але не здолела. Пасля пад'ехаў нейкі малады чалавек на машыне, ён таксама зрабіў спробы выцягнуць дзяўчынку. Ізноў не ўдалося. Пасля чаго я вырашыла неадкладна тэлефанаваць у МНС. Ратавальнікі, безумоўна, малайцы, ужо праз 3 хвіліны прыехалі.

– А адкуль з'явілася дрыгва ў цэнтры горада ды яшчэ побач з жылым комплексам, дзе шмат дзяцей?

– Там вадаём быў, але гэтым летам ён перасох. Гарадскія службы яго пачысцілі, але, напэўна, пайшлі дажджы, і з'явіліся балотныя ямы. У адну з іх дзяўчынка і правалілася. Я, як маці, уяўляю, якая трагедыя магла здарыцца! Тым больш што на вуліцы ўжо цямнела…

"Я тады начальнікам змены працаваў, – дадаў супрацоўнік Мазырскага гарадскога аддзела МНС **Аляксандр Серба**. – *Мы даволі хутка выцягнулі школьніцу на бераг, усё добра, што так закончылася. Дзяўчынцы нават дапамога медыкаў не спатрэбілася".*

Алесь СІВЫ.

Ідзе падпіска на «Народную Волю» на лістапад-снежань і першую палову 2016 года.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Анатоль ШУМЧАНКА:
«Малому бізнесу цяпер няпроста...»

Тыдзень таму полацкія прадпрымальнікі масава зачынілі свае гандлёвыя кропкі. Іпэшнікі выказалі пратэст з нагоды праверак і канфіскацыі тавару падатковай інспекцыяй і аддзелам па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі. Правяраючых цікавілі дакументы на тавар з Расіі. Паводле слоў полацкіх прадпрымальнікаў, «пастаўшчыкоў у Маскве не хвалююць праблемы беларусаў, і дакументы на тавар часам проста не выдаюцца». Днямі полацкія іпэшнікі звярнуліся да мясцовых улад. Ці здольны зварот прадпрымальнікаў змяніць сітуацыю? Пра гэта ў экспрэс-каментарыі "Народнай Волі" распавёў старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Перспектыва» ***Анатоль Шумчанка.***

– Важна, каб у мясцовых улад быў сігнал ад прадпрымальнікаў, – *гаворыць Шумчанка.* – Полацкія чыноўнікі павінны даць справаздачу пра тое, што прымусіла прадпрымальнікаў спыніць працу. У рэшце рэшт яны будуць павінны неяк адрэагаваць.

Полацкая сітуацыя – добры прыклад, што трэба і варта змагацца за свае правы. У Баранавічах, напрыклад, пачалі збіраць подпісы ў падтрымку іпэшнікаў у Полацку. Салідарнасць – гэта таксама вельмі важна.

– Як думаеце, ці мажа падобны страйк адбыцца ў іншых рэгіёнах?

– Цяжка сказаць, як будуць паводзіць сябе людзі і як будуць рэагаваць на падобныя праверкі.

– Цікава, а чыста юрыдычным шляхам можна вырашыць праблему з дакументамі на тавар з Расіі?

